усведамленне беларусамі сваёй унутранай арганічнай сувязі, з аднаго боку, і адрозненні ад суседніх народаў — з іншага. «Усе гэтыя асаблівасці Беларусі — адзначалася ў выданнях — даюць ёй права на аўтаномную федэратыўную самастойнасць у сям'і іншых народнасцей Расіі». Шлях да рэалізацыі гэтага права аўтары бачылі ў сумеснай з расійскімі рэвалюцыянерамі барацьбе супраць агульнага ворага — царскага самадзяржаўя. Аўтары артыкулаў абвяргалі сцверджанне аб забітасці і інертнасці беларускага народа, які нібыта не мог разумець і адстойваць свае інтарэсы, у тым ліку неабходнасць стварэння ў будучыні нацыянальнай дзяржавы.

Такім чынам, перыяд XIX — пачатку XX ст. стаў часам станаўлення беларусаў як нацыі. На парадак палітычнага жыцця грамадства было пастаўлена пытанне аб самавызначэнні беларусаў як нацыі. У пачатку XX ст. гэтае пытанне актуалізавалася ў дзейнасці БСГ як першай беларускай палітычнай партыі і творчасці прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі.

1. Складзіце схему «Гістарычныя ўмовы фарміравання беларускай нацыі». Канкрэтызуйце гэтыя ўмовы гістарычнымі фактамі.
2. Якой была доля беларусаў у насельніцтве сельскай і гарадской мясцовасці? Уявіце, як дадзеная суаднесенасць магла паўплываць на працэс фарміравання беларускай нацыі.
3. Растлумачце, у чым палягае непаўторнасць менталітэту беларусаў. Якія яго рысы з'яўляюцца для вас вызначальнымі?
4. Як вы думаеце, чаму нацыянальная самасвядомасць большай часткі беларусаў у XIX — пачатку XX ст. заставалася на невысокім узроўні?
5. Сфармулюйце 3 тэзісы, адлюстраваўшы ў іх асноўныя ідэі групы «Гоман».

§ 21

## § 21. Эвалюцыя канфесійных адносін у XIX — пачатку XX ст.

1. Які ўплыў на фарміраванне этнасу аказвае рэлігія?
2. Што такое ўніяцкая царква? Калі яна з'явілася на беларускіх землях? З якімі гістарычнымі падзеямі гэта было звязана?

**Канфесійная палітыка расійскіх улад на тэрыторыі Беларусі.** Да канца XVIII ст. беларускае грамадства з'яўлялася поліканфесійным. Вялікая частка шляхты вызнавала каталіцтва. Большасць беларускіх сялян (каля 3/4) належала да ўніяцкай канфесіі. На тэрыторыі Беларусі таксама пражывалі праваслаўныя, іўдзеі, мусульмане, пратэстанты, стараверы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі першапачаткова не прывяло да істотных змен у канфесійнай сітуацыі. На далучаных землях царскі ўрад імкнуўся забяспечыць палітычны спакой.

Але на працягу XIX — пачатку XX ст. стаўленне дзяржавы да пэўных канфесій і іх месца ў жыцці грамадства змянялася. На тэрыторыю Беларусі паступова стала распаўсюджвацца агульнарасійскае канфесійнае права. Згодна з ім усе рэлігіі, якія вызнаваліся насельніцтвам, дзяліліся на тры катэгорыі: пануючая праваслаўная, «дазволеныя» і «недазволеныя».

«Дазволенымі», або «прызнанымі цярпімымі», рэлігіямі з'яўляліся: каталіцтва, пратэстанцтва, іслам, іўдаізм. Іх вызнавала частка насельніцтва Беларусі. Вернікі гэтых канфесій мелі права валодаць маёмасцю, адкрываць прыходы і г. д. Аднак ім забаранялася схіляць у сваю веру праваслаўных. Пры гэтым дапускаўся пераход з нехрысціянскага веравызнання ў хрысціянскае, а таксама падтрымліваўся пераход з любога веравызнання ў праваслаўе. Зваротны ж пераход быў забаронены.

Трэцюю катэгорыю складалі стараабрадцы, якія да маніфеста 17 кастрычніка 1905 г. называліся «раскольнікамі».

*Успомніце, хто такія стараверы («раскольнікі») і па якіх прычынах яны пераследаваліся ўладамі.*

Галоўнай задачай канфесійнай палітыкі было забеспячэнне дзяржаўнай падтрымкі прывілеяванага становішча Рускай праваслаўнай царквы.

**Скасаванне ўніяцкай царквы і яго вынікі.** Пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі быў узяты курс на паступовае вяртанне ўніятаў у праваслаўе. У канцы 1820-х гг. уніяцкі мітрапаліт Іосіф Сямашка звярнуўся да імператара Мікалая I з прапановай аб'яднаць уніяцкую царкву з праваслаўнай з мэтай вызвалення ад «польскага ўплыву». Удзел некаторых прадстаўнікоў уніяцкага духавенства ў паўстанні 1830—1831 гг. прывёў да канчатковага вырашэння пытання аб ліквідацыі грэка-каталіцкай царквы.

У 1839 г. на Полацкім саборы быў падпісаны акт аб далучэнні грэка-каталіцкай царквы да праваслаўнай. У выніку праваслаўная царква атрымала звыш 1600 прыходаў і больш за 1 млн 600 тыс. новых вернікаў. У цэлым аб'яднанне прайшло спакойна, без асаблівага супраціву вернікаў.

Да 1830-х гг. расійскае самадзяржаўе да каталіцкай царквы ставілася дастаткова памяркоўна. Каталіцкая царква захавала незалежнасць у арганізацыі рэлігійнага жыцця. Царскія ўлады прытрымліваліся абавязацельстваў, якія тычацца свабоды адпраўлення каталіцкага культу. Расійскі ўрад не забараняў на сваёй тэрыторыі дзейнасць ордэна езуітаў, дазволіўшы яму адкрыць у 1812 г. акадэмію ў Полацку.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Мітрапаліт
Іосіф Сямашка
(1798–1868)

Каталіцкае духавенства па-ранейшаму імкнулася да актыўнай ролі ў грамадстве і шырокага ўзелу ў грамадска-палітычным жыцці. Аднак у рэальнасці гэтая сфера дзейнасці для яго значна звузілася.

Урад прыняў меры па кантролі за дзейнасцю каталіцкага епіскапату, які пазбаўляўся права непасрэдных зносін з рымскай курыяй. Законам забаранялася абвяшчэнне папскіх пасланняў і распараджэнняў без згоды ўрада.

Пасля паўстанняў 1830—1831 і 1863—1864 гг. адным з найважнейшых кірункаў урадавай палітыкі стала барацьба супраць уплыву каталіцкай царквы, якая падтрымлівала паўстанцаў. Былі зачынены многія касцёлы і манастыры, канфіска-



Езуіцкая акадэмія ў Полацку. Малюнак Н. Орды. Другая палова XIX ст.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Начальнік Віленскай навучальнай акругі І. Карнілаў паведамляў, што ў 1866–1867 гг. «у Віленскай, Мінскай і іншых губернях некалькі настаяцеляў касцёлаў са сваімі прыхаджанамі прынялі праваслаўе. Жыхары мястэчка Ляхавічы Слуцкага павета былі схільныя да праваслаўя, але чакалі, што скажа ім іх настаяцель. Апошні, спачуваючы іх думкам, звярнуўся да вернікаў, прысутных на набажэнстве, з кароткім словам, у якім сказаў між іншым: *«Выслухайце кожнае маё слова з увагай, так як справа ідзе пра лёс ваш і вашых дзяцей. Нагадаю час, калі вы былі падуладныя панам; калі вашы дробкі, здабытыя цяжкай працай, належалі не вам, а пану; калі замест хлеба вы елі мякіну і жылі ў такіх халупах, куды добры гаспадар не заганяе і скаціну. Але міласэрны цар даў вам свабоду і новае жыццё, пра якое вам і ў галаву не прыходзіла. … З некаторага часу я заўважаю ў вас схільнасць да праваслаўя і ніколькі за гэта не асуджаю…»* Пасля гэтай прамовы 2500 жыхароў разам са сваім пробашчам далучыліся да праваслаўя, і іх касцёл быў ператвораны ў праваслаўную царкву». І такія прыклады не былі адзінкавымі. Так, у м. Мікалаеўшчына (Мінская дыяцэзія) праваслаўнымі сталі ўсе парафіяне рымска-каталіцкага веравызнання колькасцю 700 чалавек. Падобная сітуацыя склалася ў м. Беніцы і г. Валожын Ашмянскага павета і м. Падбярэззе Віленскага павета Віленскай губерні і інш.

*Вызначце, якія змены адбыліся ў канфесійным складзе насельніцтва беларускіх зямель у другой палове XIX ст. і з чым яны былі звязаны.*

*Абмяркуйце, чаму змянілася канфесійная палітыка расійскага ўрада ў дачыненні да ўніятаў і католікаў пасля паўстанняў 1830–1831, 1863–1864 гг.*

ваны іх землі, будаўніцтва новых храмаў забаранялася, а каталіцкія службы ў шэрагу прыходаў сталі праводзіцца на рускай мове.

**Змены ў рэлігійным жыцці ў пачатку XX ст.** Нягледзячы на пэўныя абмежаванні ў канфесійным жыцці, у Расійскай імперыі былі элементы свабоды веравызнання. Прызнаныя законам неправаслаўныя рэлігійныя супольнасці мелі права на свабоду вызнання сваёй веры і публічнае правядзенне набажэнстваў. Верацярпімасць выяўлялася ў роўнасці прызнаных рэлігійных канфесій перад законам. Непрызнаныя рэлігійныя абшчыны заканадаўствам ігнараваліся і таму не мелі ніякіх правоў.

Праблема рэфармавання дзяржаўна-царкоўных адносін на аснове прынцыпу свабоды сумлення актыўна абмяркоўвалася ў канцы XIX — пачатку XX ст. расійскай грамадскасцю і прыцягвала пільную ўвагу кіруючых колаў.

Пытанне аб пашырэнні свабоды веравызнання было для ўлады справай няпростай, паколькі было звязана з пытаннем аб змяненні прававога статусу

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Чым можна растлумачыць змяненне адносін расійскіх улад да неправаслаўных рэлігій у пачатку XX ст.?*

Рускай праваслаўнай царквы (РПЦ), якая стала за два стагоддзі важнай часткай сістэмы дзяржаўнага кіравання. Змена прынцыпаў кіравання РПЦ і ўвядзенне свабоды сумлення маглі пацягнуць за сабой «ланцуговую рэакцыю» — рэфармаванне іншых звёнаў палітычнай сістэмы дзяржавы. Усё гэта ўяўляла небяспеку для самадзяржаўя.

Тым не менш 17 красавіка 1905 г. Мікалаем II быў падпісаны Указ «Аб умацаванні пачаткаў верацярпімасці». У дакуменце абвяшчаліся: свабода выбару веры ў рамках хрысціянскіх вызнанняў; права мужа і жонкі, якія пераходзяць з аднаго хрысціянскага веравызнання ў іншае, вызначаць рэлігійную прыналежнасць сваіх дзяцей, што не дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту; права пераходу праваслаўных у нехрысціянскую веру, калі да далучэння да праваслаўя яны або іх продкі вызнавалі яе.

*Абмяркуйце, якія ўнутрыпалітычныя падзеі маглі паўплываць на прыняцце ўказа 17 красавіка 1905 г.*

Неправаслаўныя канфесіі атрымалі большую свабоду для сваёй дзейнасці. Праваслаўе заставалася ў Расійскай імперыі «першасным і пануючым», але любому чалавеку дазвалялася бесперашкодна пераходзіць у іншую веру. Такая палітыка дазволіла актывізаваць сваю дзейнасць на беларускіх землях не толькі каталікам і стараабрадцам, але і пратэстанцкім суполкам.

Такім чынам, канфесійная сітуацыя на беларускіх землях у XIX ст. характарызавалася ўзмацненнем ролі Рускай праваслаўнай царквы, скасаваннем уніяцтва, абмежаваннем уплыву каталіцтва, а ў пачатку XX ст. — стварэннем пэўных умоў для распаўсюджвання свабоды веравызнання.

1. Чым характарызавалася канфесійная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XIX ст.?
2. Якія змены адбыліся ў канфесійнай палітыцы расійскага ўрада на беларускіх землях на працягу XIX ст.? Як гэта было звязана з грамадска-палітычнымі падзеямі, што адбываліся ў Беларусі?
3. Вызначце агульнае і асаблівае ў дзяржаўнай палітыцы ў адносінах да ўніяцкай і каталіцкай цэркваў на тэрыторыі Беларусі.
4. У чым заключалася пашырэнне свабоды веравызнання ў Расійскай імперыі ў пачатку XX ст.?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ